Белорусская Православная Церковь
Национальная академия наук Беларуси
Отделение гуманитарных наук и искусств НАН Беларуси
Институт истории НАН Беларуси
Минская духовная академия

# 1030-ЛЕТИЕ ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКВИ В БЕЛАРУСИ: ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ

Сборник статей участников
Международной научной конференции,
г. Минск, 9 июня 2022 года

МИНСК
Издательство Минской духовной академии
2023

УДК 23/28
ББК 86.372
Т93

*Редакционная коллегия*

к. богосл., доц. митрополит Вениамин (Тупеко); д. э. н., проф., акад. В. Г. Гусаков; д. и. н., проф., акад. А. А. Коваленя; к. богосл., доц. архим. Афанасий (Соколов); к. и. н., доц. В. Л. Лакиза; д. церк. ист., доц. А. В. Слесарев; д. и. н., доц. Н. В. Смехович; к. и. н., проф. В. А. Теплова; к. и. н., доц. П. А. Трубчик

Т93 **1030-летие** Православной Церкви в Беларуси : история и современность : сборник статей участников Международной научной конференции, Республика Беларусь, г. Минск, 9 июня 2022 г. / Белорусская Православная Церковь, Национальная академия наук Беларуси. – Минск : Издательство Минской духовной академии, 2023. – 446 с.

ISBN 978-985-7145-78-2

Сборник включает научные статьи участников Международной научной конференции «1030-летие Православной Церкви в Беларуси: история и современность», проходившей 9 июня 2022 года в Минске. Организаторами форума выступили Белорусская Православная Церковь и Национальная академия наук Беларуси.

Издание адресовано преподавателям, аспирантам, студентам, а также всем, интересующимся вопросами белорусской конфессиональной и гражданской истории.

**УДК 23/28**
**ББК 86.372**

**ISBN 978-985-7145-78-2**

© Оформление. Издательство Минской духовной академии, 2023

# ФУНКЦЫЯ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў ПРАЦЭСЕ ЎЗАКОНЕННЯ ПАДКІДЫШАЎ У ПОЛІКАНФЕСІЙНЫХ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯХ у 30-х – 50-х гг. XIX ст.

*Анофранка Н. В., кандыдат гістарычных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі кан. XVIII – пач. XX ст. Інстытута гісторыі НАН Беларуси (г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)*

У першай пал. XIX ст. дастаткова распаўсюджаныя былі злачынствы ў адносінах да непажаданых дзяцей. У першую чаргу гэта былі забойствы незаконнанароджаных немаўлят. Аднак з 30-х гг. XIX ст., як сведчаць дакументы паліцэйскіх і судовых інстанцый, пачаў распаўсюджвацца больш гуманны спосаб пазбаўлення – немаўлят пакідалі ў месцах, дзе іх хутка маглі знайсці. Такім чынам жанчына (як правіла) пазбягала здзяйснення забойства і адначасова перакладала цяжар адказнасці за непажаданае немаўля на грамадства. У адпаведнасці з расійскім заканадаўствам, такія дзеянні лічыліся злачыннымі і паліцэйска-судовыя інстанцыі пачыналі вышук вінаватых.

У вёсках і мястэчках беларуска-літоўскіх губерняў немаўлят падкідвалі рэдка, выяўлены літаральна адзінкавыя выпадкі [1; 17, арк. 13; 9, арк. 3]. Найбольшае распаўсюджанне гэта з'ява атрымала ў буйных гарадах, дзе было шмат прыезджых, а жыхары ўжо мала зналі адзін аднаго, у выніку злачынцам лёгка было застацца незаўважнымі. Акрамя гэтага, у буйных гарадах знаходзіліся дзяржаўныя інстанцыі і грамадскія ўстановы, якія бралі на сябе першапачатковае апекаванне падкідышамі (паліцыя, праказ грамадскай апекі, дабрачыннае таварыства і г. д.)

Найбольш часта немаўлят знаходзілі каля прыватных дамоў і кватэр заможных гараджан ці чыноўнікаў розных устаноў. Вера-

годна лічылася, што гэтыя людзі мелі дастатковую сацыяльную адказнасць, што павялічвала шанец немаўля выжыць. Таксама дзяцей пакідалі каля будынкаў дабрачынных арганізацый. Напрыклад, у Мінску іх рэгулярна знаходзілі каля дому таварыства дабрачыннасці [16, арк. 3; 14, арк. 9, 14 адв.;15, арк. 10]. Былі выпадкі, калі дзяцей знаходзілі бліз медычных установ [19, арк. 1]. Адметным з'яўляецца тое, што ўнутры або каля храмаў немаўлят практычна не пакідалі. У Мінску быў выяўлены толькі адзін выпадак, калі падкідыша знайшлі ў калідоры Мінскага Бернардзінскага манастыра [11, арк. 3].

Сам працэсс апекавання над знойдзеным немаўляці схематычна выглядаў наступным чынам. Жыхар горада або паліцэйскі служыцель, які знайшоў падкідыша, прыносіў яго ў памяшканне паліцэйскай часткі і перадаваў прыставу. Прыстаў у першую чаргу нес немаўля ў царкву, каб праз хрышчэнне зняць з яго першародны грэх, даць яму імя і запісаць у метрычную кнігу – такім чынам падкідыш узаконьваўся. Наступным крокам паліцыі быў пошук для немаўляці карміліцы або апякункі (у рэдкімх выпадках апякуна). Пасля гэтага паліцэйскі чыноўнік звяртаўся ў прыказ грамадскай апекі, каб падкідыша залічылі ў выхаванцы гэтай установы, а апякунцы за паслугі пачалі выплочваць грошы. Далей распачынаўся вышук маці або іншых асоб, якія былі вінаватыя ў пакіданні. Калі дзіця было знойдзена каля таварыства дабрачыннасці, то гэта арганізацыя замест прыстава займалася хростам і пошукам карміліцы.

У поліканфесійным грамадстве беларуска-літоўскіх губерняў пры пануючым становішчы праваслаўнай царквы гэты працэс узаконьвання падкідышаў меў пэўныя асаблівасці. Так, у выпадках, калі немаўляці было знойдзена без пісьмовых пасведчанняў (а такіх выпадкаў была большасць), яно атрымлівала хрост і запіс у метрычную кнігу ў пануючай праваслаўнай царкве [20; 22; 4; 7; 15; 23; 3]. На практыцы гэта выглядала наступным чынам. 27 кастрычніка 1840 г. прыстаў першай часткі Мінска данес гарадской паліцыі, што

ў 4 гадзіны раніцы на Забаравай вуліцы была знойдзена дзяўчынка па выглядзе 6 месяцаў. Яна была ахрышчына ў Мінскім кафедральным саборы і атрымала імя Параскева. Пасля гэтага дзіця было аддадзена на выхаванне пад распіску карміліцы дваранцы Разаліі Леонавай, якая пражывала на Татарскай вуліцы ў доме мешчаніна Керына [15, арк. 10–10 адв.]. У той жа дзень, 27 кастрычніка, гарадская паліцыя адправіла рапарт аб здарэнні ў Мінскі прыказ грамадскай апекі. Праз два тыдні, 12 лістапада 1840 г., Мінская гарадская паліцыя выдала прадпісанне першай паліцэйскай частцы «учинить надлежащее порядком исследование, кому именно надлежит 27 октября найденный на улице женского пола ребенок <...> и кем подброшен» [15, арк. 1].

Нават у тых рэдкіх выпадках, калі немаўля было знойдзена ў храме іншай канфесіі, але звестак пра хрост пры ім не было, яго ўзаконенне адбывалася праз праваслаўную царкву. Так, 12 мая 1857 г. у Мінскую гарадскую паліцыю звярнуўся настаяцель Мінскага Бернардзінскага кляштара і паведаміў, што ноччу 10 мая ў калідоры было знойдзена дзіця мужчынскага пола па выглядзе трох месяцаў ад нараджэння. Ніякай запісцы пры ім знойдзена не было [11, арк. 1]. Нягледзячы на тое, што падкідыш быў знойдзены ў сценах каталіцкай духоўнай установы (а гэта магло сведчыць, што маці належала да каталіцкага веравызнання), хлопчык быў «по чиноположению православной церкви <…> окрещен с наречением ему имени Федор» [11, арк. 3].

Як правіла, сярэдні ўзрост падкідышаў складаў некалькі месяцаў. Выпадкі, калі знаходзілі дзяцей ва ўзросце больш за год, былі рэдкімі. Напрыклад, ноччу 3 ліпеня 1839 г. паліцэйскі служыцель знайшоў на Аляксандраўскай вуліцы каля паліцэйскай будкі дзіця жаночага пола, апранутае ў адну верхнюю кашулю, якое плакала і скуголіла [16, арк. 3]. У рапарце прыстава другой часткі ад 6 ліпеня 1839 г. паведамлялася, што знойдзены падкідыш «лет двух, не известно, кому принадлежащий <...> в городскую полицию препровождается на дальнейшее ее распоряжение» [16, арк. 1]. Верагодней за ўсе, дзіця такога

ўзросту ўжо было ахрышчана, аднак з-за адсутнасці хоць якіх звестак знойдзеная дзяўчынка была ахрышчана ў Мінскім кафедральным саборы 22 ліпеня 1839 г. і запісана ў метрычную кнігу як Параскева. Хроснымі былі мінскі мешчанін Рыгор Якаўлеў і мінская дваранка Караліна Камоцкая, якая і ўзяла дзіця на выхаванне [16, арк. 8, 13].

Калі ўзнікалі сумнівы да якога веравызнання належыць падкідыш, дзяржаўныя інстанцыі не ішлі па шляху простага ўзаконьвання іх праз праваслаўную царкву. Паказальнай з'яўляецца справа падкідыша мужчынскага полу, якога 1 ліпеня 1840 г. на рынку ў мястэчку Койданава падкінулі ў павозку да дваранаіна Мінскай губерні Паўлу Францаву, які пражываў у засценку Камароўшчызна, было падкінута дзіця мужчынскага пола [17, арк. 13, 36–36 адв.]. Гэта немаўля было 8 ліпеня прадстаўлена ў Мінскі земскі суд. Пры аглядзе хлопчыка паліцэйскія чыноўнікі вырашылі, што «примечены были следы исполнения обрезания по еврейскому обряду». У такой сітуацыі ў земскі суд былі выкліканы павятовы лекар Цытовіч і Мінскі равін. Пасля адпаведнага агляду яны склалі заключэнне: «Состояние детородного уда означенного ребенка не можно полагать следствием действительного обрезания. А отсечение снизу крайней плоти случается от природы» [17, арк. 13 адв.]. Толькі пасля гэтага хлопчык быў адпраўлены да святара Мінскай Кацярыненскай царквы Заранкевіча, быў ахрышчаны і атрымаў імя Васіль [17, арк. 14].

Часам знаходзілі немаўлят з запіскамі, што сведчыла пра асэнсаванасць учынку. Змест такіх запісак характарызаваўся крайняй лаканічнасцю. Напрыклад, 29 красавіка 1849 г. Першая паліцэйская частка падала рапарт у Мінскую гарадскую паліцыю, у якім паведамляла, што ў 5 гадзін раніцы на Койданаўскай вуліцы паліцэйскім служыцелем быў знойдзены падкідыш жаночага пола, загорнуты ў простыя халшчовыя анучы і старую коўдру. Пры аглядзе была знойдзена запіска, у якой было напісана толькі, што дзіця ахрышчана [25, арк. 2–2 адв.]. Верагодна, така запіска была напісана на той выпадак, калі

дзіця загіне, каб над ім можна было здзейсніць адпаведныя абрады, бо для ўзаконення гэтай інфармацыі было недастаткова.

Быў выпадак, калі інфармацыя ў запісцы была такая ж лаканічная, але цалкам супрацьлеглая. Так, 18 жніўня 1844 г. прыстаў Першай часткі Мінска падаў рапарт у гарадскую паліцыю, у якім гаварылася, што 17 жніўня ў 10 гадзінаў вечара па Юр'еўскай вуліцы ў доме Шэпшаля Гецэва пад дзверы кватэры сакратара мінскага гарадскога магістрата Афанасовіча невядома хто пакінуў дзіця мужчынскага пола. Побач была знойдзена запіска на польскай мове, у якой паведамлялася, што немаўля не ахрышчана. У гэтым выпадку цяжка выявіць матывацыю таго, хто пісаў запіску. У выніку хлопчык быў ахрышчаны па праваслаўным абрадзе, атрымаў імя Іван і быў аддадзены Афанасовічу на выхаванне пад падпіску [18, арк. 1].

Часцей патрапляліся запіскі, ў якіх паведамлялася пра факт хросту і імя падкідыша. Так, 26 красавіка 1834 г. дзесяцкі Другой паліцэйскай часткі Восіп Ботаў ноччу пачуў дзіцячы плач каля сцяны дома таварыства дабрачыннасці [14, арк. 4]. Ен занес дзіця ў дом таварыства, дзе пры аглядзе была знойдзена запіска, у якой было напісана, што немаўля ахрышчана і яго завуць Іосіф. Падобная запіска была ў падкідыша мужчынскага полу, якога ўначы з 29 на 30 ліпеня 1855 г. нехта паклаў на ганак флігеля чыноўніка Гаўстана. У запісцы гаварылася, што дзіця ахрышчана і названа Мікалаем [8, арк. 1–1 адв.]. Паказальна, што, нягледзячы на лаканічнасць паведамленняў у гэтых двух выпадках, пытанне аб веравызнанні не падымалася. І наадварот, такое пытанне паўстала, калі 24 сакавіка 1851 г. вольнанаемны вартаўнік Мінскага таварыства дабрачыннасці ў 8 гадзін вечара пачуў дзіцячы плач і каля лесвіцы знайшоў немаўля. Вартаўнік занес падкідыша ў дом дабрачыннага таварыства, дзе служанка Феліцыяна пры аглядзе немаўля знайшла запіску на «польском диалекте», у якой гаварылася, што хлопчык ахрышчаны і названы Паўлам. У сувязі з гэтай запіскай перад паліцыяй паўстала задача высветліць, па якім

хрысціянскім абрадзе было ахрышчана гэта дзіця [5, арк. 1–1 адв.]. Верагодна, ў папярэдніх двух выпадках запіскі былі напісаны на рускай мове і па гэтай прыкмеце дзеці былі аднесены да праваслаўнай канфесіі.

Калі ў запісцы дакладна было пазначана, што падкідыш ахрышчаны па каталіцкім абрадзе, як правіла, яго не імкнуліся перахрысціць у Праваслаўе. Напрыклад, у звароце Мінскага дабрачыннага таварыства ў гарадскую паліцыю ад 5 чэрвеня 1847 г. гаварылася, што 4 чэрвеня 1847 г. апоўначы невядомы паклаў пад ганак дома дабрачыннага таварыства хлопчыка невядомага паходжання. Падкідыш, як вынікала са знойдзенай пры ім запісцы, быў ахрышчаны па каталіцкім абрадзе і атрымаў імя Ігнацій. Таварыства прасіла паліцыю запісаць гэтага падкідыша разам з карміліцай дваранкаю Вікторыяй Каспяровіч у ведамства прыказа грамадскай апекі, а таксама заняцца пошукамі яго бацькоў [21, арк. 1]. Падобны выпадак адбыўся 26 красавіка 1854 г., калі ў першую паліцэйскую частку звярнулася дваранка ўдава Магдалена Шульц. Яна паведаміла, што 25 красавіка 1854 г. у 11 гадзін вечара дваранка Багуслава Шабелоўская, якая пражывае ў яе ў доме, знайшла ў сенцах дзіця [12, арк. 2]. У знойдзенай запісцы гаварылася: «Religiy Rzymsko katolickey okrczony Antoni» [12, арк. 3 адв. – 4]. Магдалена Шульц перадала паліцыі немаўля разам з запіскай для адпаведных дзеянняў. Потым падкідыш быў аддадзены на пракармленне грамадзянцы Алене Казлоўскай за плату ад прыказа грамадскай апекі [12, арк. 2, 16]. Падобная сітуацыя адбылася 24 мая 1857 г., калі пад дзвярыма кватэры тытулярнага саветніка Багдановіча было знойдзена дзіця жаночага пола разам з запіскай, у якой паведамлялася, што дзяўчынцы ад нараджэння 15 тыдняў, яна ахрышчана па рымска-каталіцкаму абраду і атрымала імя Ева. Пасля правядзення вышуку паліцыя паведаміла: «Лицо, прижившие того ребенка и подбросившие его Богдановичу, не открыто и никакого подозрения не возведено. А метрической выписки о крещении его по минским при-

ходам не отыскано» [10, арк. 4–4 адв.]. У выніку было вырашана «девочку Еву оставить на попечение Богдановича, объявившего согласие взять на такое» [10, арк. 4 адв.].

Такія запіскі, дзе былі пазначаны канфесійная прыналежнасць і імя немаўля, падвышалі шанец для паліцыі знайсці бацькоў падкідыша. Напрыклад, 12 ліпеня 1855 г. пад дзвярыма кватэры губернскага сакратара Мікалая Караткова было знойдзена немаўля жаночага пола. Разам з дзяўчынкай быў знойдзены кавалак паперы, на якім па-польску было напісана, што ахрышчана яна па каталіцкім абрадзе і названа Ядзвіга [2, арк. 3]. Паліцыя пачала вышук, але знайсці вінаватых не ўдалося. Мінскі павятовы суд вырашыў закрыць гэту справу і падаў яе на рэвізію ў Мінскую палату крымінальнага суда. Пры разглядзе гэтай справы крымінальны суд знайшоў памылку. Аказалася, што першапачаткова ў дакументах паліцыі ўзрост дзяўчынкі, на момант калі яе знайшлі 12 ліпеня, быў прапісаны як 8 тыдняў [2, арк. 3]. Па заканадаўству нованароджанае дзіця павінна было быць ахрышчана на працягу трох месяцаў ад моманту нараджэння. Сыходзячы з гэтага Мінскі павятовы суд запатрабаваў ад каталіцкай кансісторыі знайсці метрыку аб хрышчэнні дзяўчынкі Ядзвігі за сакавік, май або чэрвені 1855 г. На гэты запыт каталіцкая духоўная кансісторыя адказала, што метрыкі аб хрышчэнні дзяўчынкі Ядзвігі ў 1855 г. няма. Насамрэч, на момант знаходжання дзяўчынкі ей было не 8 тыдняў, а 8 месяцаў. Адпаведна трэба было шукаць запісы ў метрычных кнігах за кастрычнік, лістапад і снежань 1854 г. У сувязі з памылкай следства справа была вернута ў Мінскі павятовый суд для паўторнага вышуку [2, арк. 6].

Парушэнні ў правілах узаконьвання падкідышаў на карысць праваслаўнай царквы здараліся, але яны былі адзінкавымі. Напрыклад, 10 снежня 1853 г. Мінскае дабрачыннае таварыства звярнулася ў гарадскую паліцыю з паведамленнем, што вечарам 9 снежня каля дома дабрачыннасці было знойдзена немаўля, прыблізна 2 тыдняў ад нараджэння. Разам з дзіцем была запіска, у якой гаварылася: «Кре-

щен в римско-католической вере на имя Юзефа». Хлопчык адразу 10 снежня быў аддадзены грудной карміліцы салдатцы Анэлі Будзінскай, якая пражывала ў Недзведзене ў 2 вярстах ад Мінска. Таксама таварыства дабрачыннасці паведаміла паліцыі, што гэты падкідыш, нягледзячы на запіску, быў перахрышчана па праваслаўным абрадзе і ўключаны ў лік выхаванцаў прыказа грамадскай апекі [6, арк. 1–1 адв.].

У той жа час адхіленне ад правілаў здаралася і ў адварротны бок. Напрыклад, 8 красавіка 1859 г. у 8 гадзін 15 хвілін вечара на ганку дома наглядчыка богаўгодных ўстаноў знойдзена дзіця жаночага пола. Дзяўчынка была абгорнута ў старую коўдру на ваце, спавітае ў палатняныя пялюшкі і прасціну. Падчас агляду ў прысутнасці прыстава Другой часткі, была знойдзена запіска з тлумачэннем, што немаўля яшчэ не ахрышчана, але народжана дваранкаю рымска-каталіцкага веравызнання. Да запіскі былі прыкладзены манета 10 капеек серабром, 5 кавалачкаў цукру і кавалак хлеба з соллю. У выніку дзяўчынка, у абыход практыцы неахрышчаных немаўлят узаконьваць праз праваслаўную царкву, была ахрышчана настаяцелям рымска-каталіцкага прыхода ксяндзом Цераевічам, і названа Антанінай. Па заяве Канторы богаўгодных устаноў ад 9 красавіка 1859 г. паліцыя пачала вышук маці гэтай дзяўчынкі [13, арк. 7].

Такім чынам, у беларуска-літоўскіх губернях легальныя хрысціянскія канфесіі хоць і не займаліся дабрачыннасцю ў адносінах падкідышаў, але непасрэдна ўдзельнічалі ў працэсе іх узаконення – хрост, наданне імя і афіцыйны запіс у метрычнай кнізе. Пры гэтым найбольш часта гэту функцыю выконвала пануючая Праваслаўная Царква. Усе падкідышы без звестак пра хрост (а такіх была большасць) аўтаматычна атрымлівалі хрышчэнне ў пануючай Праваслаўнай Царкве. У той жа час, калі ўзнікала падозранне, што немаўля магло належыць да іўдзейскага веравызнання, рабілася асведчанне праз лекара і равіна.

Часам разам з падкідышамі знаходзілі запіскі з рознай ступенню інфарматыўнасці і лаканічнасці. Калі ў запісках было напісана «ахрышчаны / не ахрышчаны», «ахрышчаны» плюс імя, у такіх выпадках дзеці ўзаконьваліся праз паўторны хрост па праваслаўным абрадзе. Калі ж з запіскі было відавочна, што дзіця ахрышчана па каталіцкім абрадзе і было запісана імя, яно пакідалася ў каталіцтве. Адзінкавыя выпадкі пераахрышчвання немаўля з каталіцкай у праваслаўную веру былі рэдкімі і адбываліся не па ініцыятыве Праваслаўнай Царквы.

## Крыніцы і літаратура

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 14383.
2. НГАБ. – Ф. 145. Воп. 2. Спр. 540.
3. НГАБ. – Ф. 145. Воп. 2. Спр. 636.
4. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 1267.
5. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 1504.
6. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 1652.
7. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 1721.
8. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 1729.
9. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 1754.
10. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 2043.
11. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 2148.
12. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 2270.
13. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 2331.
14. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 369.
15. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 383.
16. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 385.
17. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 431.
18. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 592.
19. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 747.

20. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 758.
21. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 768.
22. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 784.
23. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 785.
24. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 807.
25. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 913.